

Хутка сесія.
Фота М. Дубовіка.

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЗНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 17 (1243) ● 17 мая 1979 г. Цана 2 кап.

## Радкі ў рапарт

**20 мая лепшыя будатрады універсітэта збяруцца на свой традыцыйны злёт, каб далажыць аб гатоўнасці да працоўнага семестра, падзяліцца вопытам падрыхтоўкі да напружаных летніх месяцаў. Аб выніках падрыхтоўчага перыяду будуць рапартаваць і байцы атрада імя Ленінскага камсамола. А пакуль што — некалькі вытрымак з атраднага дзённіка.**

**28 красавіка.**

Сёння апошні дзень работы нашых працоўных дэсантаў на рэканструкцыі стадыёна «Дынама». Паўтара месяца тры разы ў тыдзень брыгады байцоў атрада працавалі на алімпійскім аб'екце. Ставілі апалубку, манціравалі арматуру, укладвалі бетон. Тон у працы задавалі Д. Мядзведзеў, М. Курыла, А. Саўчанка, У. Прушак. Гэтыя працоўныя вахты былі для нас добрай школай і праверкай перад бамаўскім летнім семестрам.

**29 красавіка.**

Атрад зрабіў паездку ў вёску Белае Крупскага раёна — на радзіму нашага ганаровага байца лётчыка-касманаўта СССР Героя Савецкага Саюза Уладзіміра Васільевіча Каваленка. З поўнай нагрузкай працавалі атрадныя лектары, удзельнікі агітбрыгады. Выступілі не толькі перад землякамі героя, але і перад вучнямі сярэдняй школы № 2 г. Крупкі. Ну, а кульмінацыя паездкі — цёплая, незабыўная сустрэча з маці касманаўта Вольгай Іванаўнай.

**4 мая.**

Сёння на БАМ адпраўлены першы кантэйнер з кнігамі, якія сабралі байцы атрада ў час аперацыі «Кнігі — будаўнікам БАМа». Першапачатковы план — сабраць не менш 5 тысяч кніг — перавыканан у два разы! Вялікую дапамогу ў зборы бібліятэкі аказалі нам школьнікі і навучэнцы ГПТВ Мінска, перад якімі мы выступалі з лекцыямі і гутаркамі пра БАМ.

**11 мая.**

Байцы атрада сустрэліся з выхаванцамі гурткоў і студый Рэспубліканскага палаца піянераў. Будаўнічая каска, прывезеная з БАМа, сувеніры і нарэшце канцэртная праграма агітбрыгады былі своеасаблівай нашай удзячнасцю хлапчукам і дзяўчынкам, якія перадалі нам 1800 кніг для будаўнікоў БАМа.

**12 мая.**

Праведзена атрадная спартакіяда. Пасля ўрачыстага пастраення і рапарта спартыўнага арганізатара атрада В. Філіпчыка нашаму камандзіру У. Карагіну прайшлі спаборніцтвы па бегу, скачках, кіданню гранаты і падцягванню на перакладзіне. Вынікі пераўзышлі чаканні: падрыхтаваных для уручэння залатых значкоў ГПА проста не хапіла. Лепшымі на спортпляцоўцы былі Н. Хацько, У. Дзюба, Ф. Кухарчук і Д. Мядзведзеў. Шкада толькі, футбалісты падкачалі: упусцілі перамогу ў матчы з камандай СБА імя У. Амельянюка (журфак). Лік сустрэчы — 2:2.

**Н. СЯРГЕЕЎ.**

## Ленінскі залік: праблемы і задачы

Важнейшай састаўной часткай Ленінскага заліку ў ВНУ з'яўляецца грамадска-палітычная практыка студэнтаў. Спасылаючыся на вопыт мінулых гадоў, па рашэнню савета універсітэта арганізацыя і правядзенне практыкі і атэстацыі па яе выніках былі сумешчаны з работай па правядзенню Ленінскага заліку. Гэта дало магчымасць найбольш поўна і ўсебакова абмеркаваць і ацаніць удзел кожнага студэнта ва ўсіх сферах дзейнасці камсамольскай арганізацыі.

Вынікам грамадска-палітычнай практыкі з'яўляецца грамадска-палітычная атэстацыя удзельнікаў Ленінскага заліку. У гэтым годзе атэстацыя праходзіла ў лютым-сакавіку. Юнакі і дзяўчаты універсітэта трымалі справаздачу аб зробленай рабоце, выкананні сваіх уласных комплексных планаў за II этап Ленінскага заліку, які быў прысвечан 60-годдзю ВЛКСМ. Вынікі атэстацыі ў цэлым адлюстроўваюць стан работы па правядзенню ГПП і заліку. З 11 тыс. удзельнікаў Ленінскага заліку «Рашэнні XXV з'езда КПСС — у жыццё!» адзнаку «выдатна» атрымалі 4312 чалавек, «добра» — 2235 чалавек, 605 удзельнікаў не былі атэставаны. Ім тэрмін атэстацыі быў перанесен. Большасць атрымалі дадатковыя канкрэтныя заданні па грамадска-палітычнай практыцы. У параўнанні з мінулым годам на 142 чалавекі павялічылася колькасць выдатнікаў Ленінскага заліку, паменшылася колькасць нездавальняючых адзнак.

Грамадска-палітычная атэстацыя удзельнікаў Ленінскага заліку праводзілася ў абставінах вялікага працоўнага і грамадска-палітычнага ўздыму ўсяго савецкага народа, камсамольцаў і моладзі, выкліканага падрыхтоўкай да выбараў у Вярхоўны Савет СССР. Студэнты універсітэта правялі вялікую работу па прапагандзе матэрыялаў XXV з'езда КПСС, прачыталі нямала лекцый, правялі сустрэчы з дэпутатамі гарадского і раённага Саветаў. Па тэрыторыі пяці раёнаў Мінскай вобласці прайшоў маршрут «зорнага» агітацыйнага прабегу.

Кожны новы этап Ленінскага заліку пачынаецца са складання асабістага комплекснага плана (АКП), які разлічан на каляндарны год. Ад таго, наколькі добра складзены асабістыя комплексныя планы, наколькі дакладна і пастаянна здзяйсняецца кантроль за іх выкананнем наогул, залежыць і работа кожнага члена ВЛКСМ. Асаблівую ўвагу тут неабходна ўдзяляць у першую чаргу студэнтам-першакурснікам. Па-першае, уліваюцца яны ў нашу сям'ю ў верасні, практычна ў Ленінскім заліку ўдзельнічаюць усяго некалькі месяцаў. Па-другое, ад таго, як мы сябе павядзём з імі, з якой патрабавальнасцю і прынцыповасцю аднясёмся да іх, у будучым будзе цалкам залежаць і іх работа на старэйшых курсах. Вось чаму на такіх факультэтах, як гістарычны, біялагічны, механіка-матэматычны, хімічны, журналістыкі, з першых дзён вучобы да кожнай акадэмічнай групы студэнтаў першага курса ў якасці грамадскага куратара замацоўваецца член камітэта камсамола. На многіх факультэтах, па прыкладу філолагаў, у снежні праводзіцца папярэдняя атэстацыя з мэтай выяўлення і выпраўлення дапушчаных пралікаў і недахопаў, аказання апаратыўнай дапамогі кожнаму першакурсніку. Атэстацыйна-метадычныя камісіі ствараюцца ў студзені-лютым, такім чынам практычна напярэдадні атэстацыі. Натуральна, што за кароткі тэрмін многага яны зрабіць не паспеюць. Мы лічым, што камісіі для першакурснікаў павінны быць створаны ўжо ў кастрычніку.

Асабісты комплексны план, як асноўны дакумент кожнага ўдзельніка Ленінскага заліку, павінен быць дакладным і канкрэтным, дзейсна ўплываючым на далейшае развіццё асобы, індывідуальным, уключаць мерапрыемствы па ідэйна-палітычнаму выхаванню, прафесіянальнаму росту (вучобе, удзелу ў навуковых даследаваннях), мерапрыемствы па маральнаму і эстэтычнаму, фізічнаму выхаванню. Прычым з году ў год АКП павінен улічваць узроставыя змены, гэта значыць ускладняцца. Разам з тым часцей за ўсё ў планы з году ў год уключаюцца адны і тыя ж работы У. І. Леніна, да таго ж у многія і праграмныя, рэдка сустракаюцца абавязацельствы па здачы норм ГПА. Вядома, што ўсяго не прадугледзіш і не заплануеш. А таму, відаць, мэтазгодна перыядычна дапаўняць планы, уносіць пэўную карэкціроўку. Тут сваё слова яшчэ не сказаў камітэт камсамола. Вынікі грамадска-палітычнай практыкі падводзяцца на атэстацыі. Непасрэдна ёй папярэднічаюць субяседаванні членаў камісіі з камсамольцамі, пытанне падрыхтоўкі да атэстацыі абмяркоўваецца на камсамольскім бюро групы. Бюро групы напярэдадні абмяркоўвае выкананне планаў камсамольцамі і сумесна з членамі атэстацыйна-метадычнай камісіі вырашае ў кожным канкрэтным выпадку пытанне аб допуску або нядопуску члена ВЛКСМ да атэстацыі. На самай справе такая падрыхтоўчая работа далёка не ўсюды ўвайшла ў практыку работы камсамольскай арганізацыі. Часта ўсё гэта адбываецца ўжо на самой атэстацыі. Таму і працягваецца яна па 3—4 гадзіны, а то і 5 гадзін, як самы цяжкі экзамен. Атэстацыя — гэта размова аб зробленым і тым, што намячаецца на новы этап.

Мы лічым, што пры падрыхтоўцы да атэстацыі на кожным факультэце для членаў камісіі павінны быць праведзены ўзорна-паказальныя атэстацыі, з наступным разборам усіх спрэчных момантаў, з высвятленнем да канца ўсіх пытанняў. Аналагічную работу, але па дзеянню бюро груп павінны прарабіць і камітэты камсамола.

Штогод мы прапануем камітэтам камсамола да ўдзелу ў рабоце атэстацыйных камісій прыцягваць ветэранаў працы і камсамола, кіраўнікоў падшэфных арганізацый, прадстаўнікоў адміністрацыі. На жаль, такая патрэбная практыка яшчэ не ўсюды ўкаранілася. У гэтым плане хочацца адзначыць камітэты камсамола механіка-матэматычнага, юрыдычнага, філалагічнага факультэтаў.

Як мы ўжо адзначалі, у ходзе атэстацыі былі неатэставаны 605 камсамольцаў. З іх 510 чалавек — па прычыне акадэмічнай непаспяховасці, астатнія — па іншых прычынах. Наяўнасць такіх камсамольцаў патрабуе дадатковай работы камітэта камсамола, атэстацыйна-метадычных камісій з гэтымі юнакамі і дзяўчатамі. Кожнаму з іх павінны быць пастаўлены канкрэтныя задачы, індывідуальныя даручэнні, пры выкананні якіх ён дапускаецца да паўторнай атэстацыі. У цэлым гэта работа вядзецца паспяхова. На факультэтах вызначаны канкрэтныя тэрміны правядзення паўторных атэстацый, праводзіцца дадатковая работа з неатэставанымі. Правільна робяць гэта камітэты камсамола ФПМ, факультэта радыёфізікі і электронікі, хімічнага, дзе атэстацыю гэтых удзельнікаў Ленінскага заліку будзе прымаць агульнафакультэцкая камісія на чале з намеснікам дэкана ці сакратаром партбюро.

Ленінскі залік і ГПП абавязковыя для ўсіх членаў ВЛКСМ, у тым ліку і супрацоўнікаў, якіх у нас ва універсітэце налічваецца амаль 1,5 тысячы чалавек. У цэлым атэстацыя ў іх прайшла паспяхова. Разам з тым не ўсюды яшчэ гэтаму важнаму выніковаму мерапрыемству года аддавалі вялікую ўвагу. Так, у камсамольскай арганізацыі праблемнай навукова-даследчай лабараторыі і сектара прыкладной сацыялогіі БДУ ўсе 30 чалавек былі атэставаны. У той жа час у некаторых камсамольцаў адсутнічалі ўласныя комплексныя планы, ні адзін з членаў ВЛКСМ не дакладваў аб ходзе выканання свайго плана, членам атэстацыйнай камісіі праекты ўласных комплексных планаў не былі прадстаўлены.

У тых камсамольскіх арганізацыях, дзе работа па ГПП і Ленінскаму заліку вядзецца сур'ёзна і па-дзелавому, у баку ад гэтай важнай справы не застаюцца і замежныя студэнты. Пытанню іх прыцягнення да ўдзелу ў Ленінскім заліку да цяперашняга часу камітэты камсамола не ўдзялялі пэўнай увагі. Станоўчы вопыт у гэтым напрамку ёсць толькі на фізічным, філалагічным і факультэце радыёфізікі і электронікі, дзе ўсе студэнты з ГДР і Чэхаславакіі актыўна ўдзельнічалі ў Ленінскім заліку.

Выбарны камсамольскі актыў у цэлым у нас працуе добра. Перад атэстацыяй гэтага года мы прапанавалі ўсіх камсамольцаў-актывістаў, пачынаючы з сакратароў акадэмічных груп і канчаючы членамі камітэта камсамола, атэставаць напярэдадні на камітэтах камсамола з наступнай справаздачай іх у сябе ў групе перад членамі атэстацыйна-метадычных камісій. Трэба адзначыць, што гэтая форма работы паспяхова зарэкамендавала сябе на юрыдычным, механіка-матэматычным, радыёфізічным факультэтах. Прыкладам прынцыповага падыходу да атэстацыі сваіх сяброў можа быць атэстацыя ў 5-й групе 4-га курса юрфака.

Накіроўваючы сваіх прадстаўнікоў у састаў розных выбарных органаў, мы аўтаматычна, па традыцыі, прыпісваем ім вядомую добрасумленнасць, актыўнасць, лічым, што яны там заўсёды добра працуюць. У гэтым годзе прафком універсітэта перад атэстацыяй звярнуўся з просьбай не атэставаць 11 членаў сваіх камісій, якія амаль ні разу не былі за гэты год на пасяджэннях гэтых органаў грамадскага кіравання.

У ходзе чарговага этапа Ленінскага заліку, прысвечанага 110-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна, камітэтам камсамола прадстаіць вялікая работа. Гэты апошні этап Ленінскага заліку ў 1980 г. закончыцца Усесаюзнай ленінскай паверкай, на якой кожны камсамолец павінен будзе трымаць справаздачу перад партыяй, перад краінай аб тым, як ён удзельнічае ў будаўніцтве камунізму, чым ён адзначае слаўны юбілей Ільіча. Ужо зараз неабходна прааналізаваць прынятыя комплексныя планы, дабіцца таго, каб кожны юнак і дзяўчына, кожны член ВЛКСМ бралі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па збору матэрыялаў для напісання «Летапісу славы народнай», а таксама экспанатаў для будучага музея гісторыі Ленінскага камсамола Беларусі, па стварэнню новых музеяў і пакояў рэвалюцыйнай, баявой і працоўнай славы савецкага народа.

Ленінскі залік і грамадска-палітычная практыка па праву з'яўляюцца найбольш апрабіраваным і дзейсным сродкам камуністычнага выхавання моладзі. І няма сумнення ў тым, што сённяшняя наша размова ў многім будзе садзейнічаць далейшаму развіццю і паглыбленню гэтых форм работы ў камсамольскіх арганізацыях.

**М. ПРЫГОДЗІЧ,**
**намеснік сакратара камітэта камсамола БДУ.**

ўся кан

# Два бакі медаля

Кожны год Белдзяржуніверсітэт праводзіць традыцыйную лёгкаатлетычную эстафету на вуліцах горада-героя Мінска, прысвечаную дню нараджэння У. І. Леніна.

На гэты раз у арганізацыйны камітэт спаборніцтваў было пададзена каля 110 заявак ад спартыўных калектываў сярэдніх школ, прафесіянальных вучылішчаў, тэхнікумаў, вытворчых аб'яднанняў і ВНУ. За апошнія гады гэта рэкордная колькасць заявак.

На плошчы У. І. Леніна адбыўся парад і ўрачыстае адкрыццё эстафеты. Спартсмены ўсклалі кветкі да помніка правадыру.

Сырое надвор'е, мокры асфальт зусім не спрыялі паказу лепшых вынікаў. Але лёгкая атлетыка любіць мужных спартсменаў, якія вядуць барацьбу пры любых абставінах.

Галоўныя суддзі спаборніцтва —майстры спорту СССР В. Я. Шпігаў і В. В. Зарэцкая. Першымі выклікаюць на старт вучняў школ. Адзінаццаць этапаў трэба пераадолець юным спартсменам. Эстафетную палачку лепш пранеслі вучні сярэдняй школы № 87, другімі былі вучні сярэдняй школы № 19, трэцімі — сярэдняй школы № 101 — мінулагоднія пераможцы кросу.

Праходзіць кароткі час, і стартуюць прадстаўнікі ПТВ. Перамагла каманда ГПТВ-52, а калектывы ГПТВ-9 і ГПТВ-8 засталіся адпаведна на другім і трэцім месцах.

Новым уладальнікам кубка сярод каманд тэхнікумаў стаў спартыўны калектыў радыётэхнікаў. Каля 7 секунд прайгралі ім сябры з каманды індустрыяльна-тэхнічнага тэхнікума. Трэцяе месца ў прадстаўнікоў тэхнікума сувязі.

Другі год запар пераможцам эстафеты сярод калектываў вытворчых аб'яднанняў становіцца СК «МАЗ», другім — СК МВА імя У. І. Леніна «Падарожнік», трэцім — СК «Камвольшчык».

Самая вострая і напружаная барацьба ішла за галоўны прыз эстафеты, які разыгрываўся сярод спартыўных каманд ВНУ. Спартсменам трэба было пранесці эстафетную палачку праз 20 этапаў— ад плошчы У. І. Леніна да плошчы М. І. Калініна і адтуль назад.

Амаль са старту вызначыўся лідэр — каманда ІФК-1. З пятага этапа лідэрства захапіла каманда БДУ. Так і вялася барацьба ў асноўным паміж гэтымі камандамі да паловы дыстанцыі. Але мітусня і дрэнны прыём палачкі спартсменамі БДУ абумовілі іх адрыў ад каманды інстытута фізкультуры. Прайграны адрэзак дыстанцыі ўжо нельга было адыграць. На фініш першымі прыйшлі студэнты ІФК-1, больш паловы мінуты прайгралі нашы красмены, трэцяе месца занялі студэнты МРТІ.

Камандам-пераможцам былі ўручаны пераходныя кубкі і ганаровыя граматы.

Каманда БДУ паўтарыла поспех мінулага года. Але заглянем і на другі бок медаля. Памылкі, якія былі зроблены спартсменамі на этапах, асабліва пры передачы эстафетнай палачкі, яшчэ можна адпрацаваць на трэніроўках, бо спартыўны сезон толькі пачынаецца.

А вось чым растлумачыць тое, што на свае этапы спартсмены БДУ і суддзі з плошчы У. І. Леніна дабіраліся хто пешшу, хто «зайцам» у тралейбусе? Свайго аўтобуса, каб развезці па этапах людзей, у каманды БДУ не было. Мы з зайздрасцю пaглядалі здалёк на рознакаляровыя аўтобусы з іншых ВНУ, сярэдніх школ, вытворчых аб'яднанняў, дзе сядзелі спартсмены, схаваўшыся ад дажджу, — усё ж свой дах над галавой.

Успамінаецца справаздачна-выбарная спартыўная канферэнцыя універсітэта, дзе выступаючыя абяцалі больш увагі ўдзяляць спартсменам і іх патрэбам. Гэта ўсё пакуль толькі словы.

З боку трэнераў каманды, саміх спартсменаў, арганізацыйнага камітэта і суддзяў было ўсё зроблена, каб спаборніцтвы прайшлі паспяхова і арганізавана.

Вось так, з першым веснавым поспехам лёгкаатлетаў БДУ зноў прыйшлі іх старыя клопаты.

**М. КАСЯК.**

# ЧАКАЕ «НАРАЧ»

Хутка заканчваецца вучэбны год. І хоць асноўныя клопаты сёння — аб прадстаячых экзаменах і заліках, ва універсітэце поўным ходам ідзе падрыхтоўка да летняга сезону, да арганізацыі адпачынку студэнтаў.

Вялікая работа вядзецца па падрыхтоўцы да адкрыцця інтэрнацыянальнага аздараўленча-спартыўнага лагера на возеры Нарач. Аздараўленчы лагер, які існуе з 1957 года, стаў любімым месцам адпачынку студэнтаў універсітэта. Ён размешчан у адным з прыгажэйшых месц нашай рэспублікі. Тут прырода як быццам сама ўсё прадугледзела для адпачынку: цудоўнае возера, пясчаныя пляжы, багатыя лясныя масівы, чыстае паветра.

Штогод у лагеры, які працуе ў тры змены, адпачывае 750 студэнтаў. У ім разам з беларускімі студэнтамі ў парадку абмену праводзяць свае канікулы пасланцы Ерэванскага і Калінінградскага універсітэтаў, студэнты з краін Азіі, Афрыкі, Лацінскай Амерыкі, якія займаюцца ў нашым універсітэце. У лагеры яны маюць магчымасць займацца спортам, мастацкай самадзейнасцю, глядзець кінафільмы і тэлеперадачы, карыстацца бібліятэкай і атрымліваць неабходную медыцынскую дапамогу.

Папулярнасцю сярод студэнтаў карыстаюцца сустрэчы з ветэранамі партыі, праслаўленымі воінамі і партызанамі, перадавікамі вытворчасці.

Спецыфіка лагера ў тым, што ў кожную змену амаль палова адпачываючых — замежныя студэнты. Улічваючы гэта, пры арганізацыі мерапрыемстваў удзяляецца значная ўвага азнаямленню маладых людзей, прыехаўшых з замежных краін, з нашай рэчаіснасцю, з савецкім ладам жыцця. Гэтым мэтам садзейнічаюць лекцыі, гутаркі, шматлікія сустрэчы, віктарыны, сумесныя рэпетыцыі ў гуртках мастацкай самадзейнасці, экскурсіі і г. д.

Неабходна адзначыць, што, знаходзячыся ў лагеры, студэнты не забываюць і аб працы. Кожную змену яны па некалькі дзён працуюць у калгасах, абсталёўваюць спартыўныя збудаванні, сваімі сіламі прыбіраюць жыллёвыя пакоі, клуб, сталовую, пляж, рэгулярна дзяжураць на кухні, дапамагаюць ў нарыхтоўцы прадуктаў і прыгатаванні ежы. Карацей кажучы, лагер знаходзіцца на поўным самаабслугоўванні.

1 ліпеня гэтага года аздараўленчы лагер нашага універсітэта 23 раз будзе прымаць адпачываючых. Зараз вядзецца падрыхтоўчая работа да яго адкрыцця. Створана і працуе камісія, якая павінна падрыхтаваць лагер да прыёму студэнтаў. Складзен план работы камісіі, вызначан аб'ём рамонтных і будаўнічых работ, складзен пералік нехапаючага інвентару, і мэблі, заканчваецца камплектаванне лагера супрацоўнікамі.

Камісіі прадстаіць праявіць арганізаванасць і аператыўнасць, каб своечасова падрыхтаваць матэрыяльную базу лагера.

Вялікая адказнасць ускладаецца на камсамольскія і прафсаюзныя арганізацыі. У першую чаргу ад іх патрабуецца самым сур'ёзным чынам падысці да адбору студэнтаў, накіроўваемых у лагер. Вельмі важна, каб накіроўваліся лепшыя, хто сваёй вучобай і грамадскай работай заслужыў гэта права. Неабходна асаблівую ўвагу ўдзяліць студэнтам з аслабленым здароўем, прадаставіць ім у першую чаргу магчымасць адпачыць і набрацца сіл. Трэба памятаць, што супрацоўнікам лагера цяжка будзе справіцца з пастаўленымі задачамі без апоры на студэнцкі калектыў. Таму пажадана, каб у ліку адпачываючых былі арганізатары камсамольскай і прафсаюзнай работы, спартсмены, удзельнікі калектываў мастацкай самадзейнасці, слухачы і выпускнікі факультэта грамадскіх прафесій.

Партыйныя, савецкія і прафсаюзныя арганізацыі ўвесь час праяўляюць клопат аб адпачынку і паляпшэнні здароўя студэнцкай моладзі, ствараюць для гэтага неабходныя ўмовы, стымулююць дзейнасць усёй аздараўленчай работы.

Адной з праяў гэтага клопату з'яўляюцца агляды-конкурсы на лепшую арганізацыю адпачынку ў аздараўленча-спартыўных лагерах. Лагер нашага універсітэта прымае ўдзел у іх. Па выніках работы 1977 і 1978 гадоў ён быў адзначан у ліку лепшых па арганізацыі культурна-масавай, аздараўленчай і спартыўнай работы. Калектыў лагера ў прадстаячым сезоне мае намер зрабіць усё, каб замацаваць дасягнутыя вынікі, арганізаваць цікавы і змястоўны адпачынак.

**Р. МАЛЮКОВІЧ,**
**дацэнт кафедры гісторыі КПСС прыродазнаўчых факультэтаў, начальнік інтэрнацыянальнага аздараўленча-спартыўнага лагера «Нарач».**



Нядаўна ва універсітэце прайшло першынство па шахматах.

# ПЕРАМАГАЙ СЯБЕ!

**Вось ужо два гады на кафедры псіхалогіі БДУ на базе студэнцкага навуковага гуртка праводзіцца сістэматычнае навучанне студэнтаў методыцы і навыкам псіхалагічнага самакіравання — аўтагеннай трэніроўцы.**

**За гэты час у нас паявілася ўпэўненасць у неабходнасці больш шырокага азнаямлення студэнтаў з гэтай малараспаўсюджанай, але дастаткова эфектыўнай у пэўным плане формай самавыхавання.**

**Намі на розных курсах шэрагу факультэтаў было праведзена апытанне з мэтай вызначыць актуальнасць навучання навыкам аутагеннай трэніроўкі. У выніку аналізу запоўненых анкет аказалася, што 30 працэнтаў студэнтаў адчуваюць патрэбу ў пэўнай карэкцыі свайго псіхічнага стану, у паляпшэнні сну, у нармалізацыі працэсаў працы і адпачынку, у зняцці перадэкзаменацыйнага хвалявання.**

**Поспехі студэнтаў, якія ўжо авалодалі метадам і навыкамі аутагеннай трэніроўкі, дазволілі нам рэкамендаваць аутатрэнінг са старонак газеты «Беларускі універсітэт».**

**У даступнай форме методыку аўтагеннай трэніроўкі на старонках газеты выкладае ўрач-псіхатэрапеўт Г. Я. МАЗО.**

**Р. І. ВАДЭЙКА,**
**загадчык кафедры псіхалогіі, дацэнт.**

На працягу жыцця чалавек увесь час знаходзіцца паміж двума крайнімі полюсамі: працы і адпачынку, напружанасці і расслаблення, узбуджанасці і тармажэння, бодрасці і сну. Гэтыя два станы ўвесь час чаргуюцца. Пасля напружанасці і работы адных сістэм арганізма наступае іх адпачынак, а ў гэты час функцыянуюць другія сістэмы. У гэтым заключаецца так званая «рухомая раўнавага» арганізма, які працуе. Але празмерна моцнае і працяглае напружанне арганізма часта становіцца прычынай хваравітых змен, звязаных з парушэннем яго рухомай раўнавагі.

Папярэдзіць гэта парушэнне дапаможа вам малавядомая, але вельмі эфектыўная форма адпачынку, праходзячага ў выніку самаўнушэння, які здзяйсняецца на фоне расслаблення мышц цела. Для таго, каб авалодаць гэтай формай адпачынку, неабходна заняцца аутагеннай трэніроўкай.

«Аутагенная трэніроўка, — як сказаў савецкі псіхатэрапеўт М. І. Спірыдонаў, — гэта не толькі аптэчка хуткай дапамогі пры бяссонніцы і стамленні, але і сродак, які дазваляе чалавеку валодаць сабой у складаных сітуацыях і зніжаць адмоўныя эмоцыі».

Слова «аутагенная» складаецца з двух слоў: «аута» — сам і «генас» — нараджаючы, выпрацоўваючы, гэта значыць сам сябе выпрацоўваючы, нараджаючы нанава. Гэта трэніроўка, якая праводзіцца самім чалавекам з мэтай самавыхавання, самаўдасканалення, з мэтай прафілактыкі нервова-эмацыянальнай перанапружанасці і ўзнікнення хвароб. Заняткі аутагеннай трэніроўкай садзейнічаюць нармалізацыі сну, адначасова паляпшаецца якасць адпачынку, агульнае самаадчуванне і настрой, зніжаецца хваляванне перад адказным мерапрыемствам. Таму заняткі аутагеннай трэніроўкай не павінны адкладвацца на «заўтра»; памятайце — «адно сёння лепш за сто заўтра».

З чаго пачаць практычныя заняткі па псіхалагічнаму самакіраванню, аутагеннай трэніроўцы?

Спачатку важна навучыцца супакойвацца, пераадольваць хваляванне, калі гэта неабходна, «адключацца» ад непрыемных думак, «прыходзіць у сябе». Калі чалавек хвалюецца, ён дыхае часта і неглыбока. Але калі ў яго добры настрой, ён дыхае лёгка, свабодна, раўнамерна, не часта і глыбока. Дык вось, канцэнтрацыя ўвагі на дыханні, здольнасць прымусіць сябе дыхаць спакойна і раўнамерна пры хваляванні — гэта ўжо на 50 працэнтаў перастаць хвалявацца. Дыхаць патрэбна носам, паглыбей. Абавязковы працяглы і спакойны выдах. Частата дыхання — 14—16 разоў у мінуту.

Так, з сённяшняга дня вы беpаце пад кантроль сваё дыханне і асабліва пры хваляванні. А каб эфект быў лепшы, узмацняйце гэты кантроль «дыхальнымі формуламі» — словамі самаўнушэння, якія абавязкова патрэбна ў думках вымаўляць займаючыся аутагеннай трэніроўкай. Прычым вымаўляць іх патрэбна толькі на выдыху ці ў час паузы паміж удыхам і выдыхам.

**«Дыхальная формула»:**

«Я спакойны... Я зусім спакойны...

Маё дыханне роўнае і спакойнае...

Дыханне раў-на-мер-нае...

Мне дыхаецца лёгка і спакойна...

Дыханне стала роўным і спакойным...

Кожны ўдых напаўняе мяне спакоем і адпачынкам...

Я спакойны... Я зусім спакойны...

Заўсёды... Усюды...

У любых абставінах...»

Гэта практыкаванне можаце выконваць заўсёды, усюды, у любым месцы і ў любым становішчы, як толькі вы адчуеце неабходнасць супакоіцца.

**(Працяг будзе.)**

# МЕСЦЫ РАЗМЕРКАВАНЫ

Да дня друку былі падведзены вынікі конкурсу на лепшы матэрыял аб прафсаюзным жыцці універсітэта, аб'яўленага прэсцэнтрам прафкома БДУ і рэдакцыяй газеты «Беларускі універсітэт».

Першае месца прысуджана Аляксандру Халецкаму за матэрыялы «Не спыняцца на дасягнутым» (№ 8 г. г.), «Дзеля любімай справы» (№ 12 г. г.). Другое месца —Мікалаю Лахвічу за матэрыял «Гучаць радкі вершаў» (№ 3 г. г.). Трэцяе месца падзялілі Алена Філіманюк за матэрыял «Адчуваць адказнасць» (№ 13 г. г.) і Лідзія Серык за матэрыял «Уменне быць наперадзе» (№ 9 г. г.). Пераможцаў чакаюць граматы прафкома БДУ і каштоўныя падарункі.

Рэдакцыя і прафком БДУ віншуюць пераможцаў і жадаюць новых творчых поспехаў.

(ПРЭС-ЦЭНТР ПРАФКОМА).

Рэдактар А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.